## Список использованных источников


1. Доктрина продовольственной безопасности Российской Федерации, утвержденной Указом Президента Российской Федерации от 30 января 2010 г. № 120 // СЗ РФ 2010. № 5. Ст. 502.

2. Соглашение по субсидиям и компенсационным мерам (ВТО, Уругвайский раунд многосторонних торговых переговоров, 15 апреля 1994 г.) // СЗРФ. 2012. № 37 (приложение, ч. VI). С. 2733-2775.

3. Соглашение по сельскому хозяйству (ВТО, Уругвайский раунд многосторонних торговых переговоров, 15 апреля 1994 г.) // СЗРФ. 2012. № 37 (приложение, ч. VI). С. 2539-2565.

4. Смирнов С.А. Всемирная торговая организация: документы и комментарии (многосторонние торговые соглашения) / Под ред. С.А. Смирнова М., 2001.

5. Указ Президента Российской Федерации от 6 августа 2014 г. № 560 «О применении отдельных специальных экономических мер в целях обеспечения безопасности Российской Федерации» // СЗРФ. 2014. № 32. Ст. 4470.

6. Постановление Правительства Российской Федерации от 7 августа 2014 г. № 778 «О мерах по реализации указов Президента Российской Федерации от 6 августа 2014 г. № 560, от 24 июня 2015 г. № 320 и от 29 июня 2016 г. № 305» // СЗРФ. 2014. № 32. Ст. 4543.

7.Шагайда Н.И., Узун В.Я. Продовольственная безопасность в России: мониторинг, тенденции и угрозы //http://www.ranepa.ru/about-the-academy/consulting-services/scientific-reports.html (дата обращения: 30.10.2014 г.).

8.Положение о фирменном магазине предприятия (объединения): утв. Приказом Минторга Республики Беларусь 27.10.1998 №138 // Нац. Реестр правовых актов Республики Беларусь. 199. №19. 8/1419.

9. Белорусские аграрии увеличивают поставки животноводческой продукции на российский рынок // http://www.meat.su/?news/industry/details/941 (дата обращения: 30.10.2014 г.).


УДК 347.77:004.738.5

# ДА ПЫТАННЯ АБ ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫХ АБМЕЖАВАННЯХ ПРЫ ЛІЦЭНЗІЙНЫМ ВЫКАРЫСТАННІ АБ'ЕКТА ПРАМЫСЛОВАЙ УЛАСНАСЦІ Ў СЕТЦЫ ІНТЭРНЭТ

*Казлоўская В.В.*
*Віцебскі дзяржаўны ўнівесітэт імя П.М. Машэрава*

У ліцэнзійных дагаворах аб прадастаўленні права выкарыстання аб'екта прамысловай уласнасці ў сетцы Інтэрнэт (далей – Інтэрнэт, Сетка), мэтазгодна ўзгадніць значныя для бакоў ўмовы. На нашу думку, адным з такіх з'яўляецца ўмова аб тэрыторыі, на якой дапускаецца выкарыстанне аб'екта прамысловай уласнасці. Згодна з заканадаўствам яно не адносіцца да



Репозиторий ВГУ

катэгорыі істотных умоў, але яго адсутнасць або недакладнае вызначэнне ў тэксце дагавора могуць справакаваць ўзнікненне спрэчкі паміж бакамі.

Значная ўвага ў юрыдычнай літаратуры надаецца даследаванню пытання аб тэрыторыі, на якой дапускаецца выкарыстанне аб'екта прамысловай уласнасці [3], [2, с. 116], [4, с. 128]. Гэту ўмову называюць таксама «тэрытарыяльнымі абмежаваннямі» выкарыстання аб'екта прамысловай уласнасці [1, с. 164]. Ліцэнзійная дамова можа прадугледжваць, што права на выкарыстанне аб'екта прадастаўляецца (дзейнічае) на тэрыторыі асобнай краіны, групы краін (рэгіёну) або часткі дзяржавы [1, с. 164]. Тэрытарыяльныя межы дзеяння правамоцтваў ліцэнзіята могуць супадаць з тэрыторыяй дзеяння патэнта або пасведчання на аб'ект прамысловай уласнасці альбо быць больш вузкай за гэту тэрыторыю.

Заканадаўства аб аб'ектах прамысловай уласнасці, у адрозненне ад Закона Рэспублікі Беларусь ад 17 мая 2011 г. «Аб аўтарскім праве і сумежных правах» (далей – Закон аб аўтарскім праве) (арт. 45) [6], не ўтрымлівае агаворкі на выпадак адсутнасці ў ліцэнзійнай дамове ўмовы аб тэрыторыі, на якой дапускаецца выкарыстанне аб'екта прамысловай уласнасці. Магчыма, гэта тлумачыцца тым, што згодна з прынцыпу тэрытарыяльнасці інтэлектуальнай уласнасці прававая ахова, якая прадстаўляецца аб'ектам прамысловай уласнасці ў канкрэтным дзяржаве, абмяжоўваецца межамі гэтай дзяржавы [5, с. 698]. Дакладней будзе сказаць – межамі дзеяння патэнта або пасведчання, выдадзенага ў дачыненні да аб'екта прамысловай уласнасці, якімі могуць ахопліваецца тэрыторыі адной або некалькіх краін (напрыклад, еўразійскі або еўрапейскі патэнты).

Мяркуем, што калі ў ліцэнзійным дагаворы адсутнічае умова пра тэрыторыю, на якой дапускаецца выкарыстанне аб'екта прамысловай уласнасці, то магчымыя два варыянты вызначэння гэтай тэрыторыі. Першы варыянт –прымяненне аналогіі закона. Згодна з пунктам 3 артыкула 45 Закона аб аўтарскім праве «пры адсутнасці ў аўтарскім дагаворы ўмовы аб тэрыторыі, на якой дапускаецца выкарыстанне твора, дзеянне дагавора абмяжоўваецца тэрыторыяй Рэспублікі Беларусь» [6]. Другі варыянт – абмежаванне тэрыторыі, на якой дапускаецца выкарыстанне аб'екта прамысловай уласнасці, тэрыторыяй дзеяння выключных правоў, якія вынікаюць з патэнта або пасведчання, выдадзеных на аб'ект прамысловай уласнасці.

Асаблівую складанасць можа выклікаць фармуляванне ўмовы аб тэрыторыі ў ліцэнзійных дагаворах аб прадастаўленні права выкарыстання аб'екта прамысловай уласнасці ў Інтэрнэце. Як было сказана, дзеянне выключнага права на аб'ект прамысловай уласнасці абмежавана тэрыторыяй краін, дзе дзейнічае ахоўны дакумент. Але у Інтэрнэту няма межаў, падобных тым, якія ёсць у дзяржавы. У сувязі з гэтым дакладнае вызначэнне ў дамове тэрытарыяльных рамак выкарыстання аб'екта прамысловай уласнасці можа апынуцца няпростай задачай.

Разгледзім у якасці прыкладу таварны знак як аб'ект прамысловай уласнасці, які найбольш выкарыстоўваецца ў Сетцы. Якім чынам у

Рэпазіторый ВДУ

ліцэнзійнай дамове можа быць агаворана ўмова аб тэрыторыі выкарыстання ў Інтэрнэце гэтага сродка індывідуалізацыі?

Калі абазначэнне зарэгістравана ў якасці таварнага знака толькі ў Рэспубліцы Беларусь, прававой аховай ён будзе карыстацца толькі на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Значыць, і ў ліцэнзійнай дамове выкарыстанне таварнага знака неабходна будзе абмежаваць тэрыторыяй Рэспублікі Беларусь. Відавочна, што ў такім выпадку ліцэнзіяту будзе прадастаўлена магчымасць выкарыстоўваць таварны знак на сайтах, якія ўваходзяць у нацыянальны сегмент сеткі Інтэрнэт.

Згодна з заўвагай да падпункта 1.2 пункта 1 Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 1 лютага 2010 г. № 60 «Аб мерах па ўдасканаленні выкарыстання нацыянальнага сегмента сеткі Інтэрнэт» (далей – Указ № 60)) «пад нацыянальным сегментам сеткі Інтэрнэт разумеецца сукупнасць інфармацыйных сетак, сістэм і рэсурсаў, якія маюць падключэнне да сеткі Інтэрнэт, размешчаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і (або) выкарыстоўваюць іерархічныя імёны нацыянальнага сегмента сеткі Інтэрнэт» [7]. Даменнымі імёнамі нацыянальнага сегмента сеткі Інтэрнэт у цяперашні час з'яўляюцца імёны даменных зон «.by» і «.бел» (гл. заўвагу да пункту 2 Загаду Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь ад 18 чэрвеня 2010 г. № 47 «Аб некаторых пытаннях рэгістрацыі даменных імёнаў у прасторы іерархічных імёнаў нацыянальнага сегмента сеткі Інтэрнэт» (далей – Загад)) [8].

У сувязі з гэтым узнікае пытанне: Што рабіць ўладальніку выключнага права, калі высветліцца, што ліцэнзіят выкарыстоўвае таварны знак не ў нацыянальным сегменце сеткі, а, да прыкладу, у рускамоўных даменных зонах «.ru» ці «.su»? Калі выключнае права на аб'ект прамысловай уласнасці не ахоўваецца ў краіне, якой належыць адпаведная даменная зона, абараніць яго ў гэтай дзяржаве будзе немагчыма.

Адзначым усё ж, што ў беларускім заканадаўстве ёсць патрабаванне, якое дазваляе ў пэўным сэнсе «прывязаць» суб'ектаў, якія ажыццяўляюць у Рэспубліцы Беларусь камерцыйную дзейнасць з дапамогай Інтэрнэту, да нацыянальнай даменнай зоны. Так, пунктам 2 Указа № 60 прадугледжана, што « з 1 ліпеня 2010 г. дзейнасць па рэалізацыі тавараў, выкананню работ, аказанні паслуг на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з выкарыстаннем інфармацыйных сетак, сістэм і рэсурсаў, якія маюць падключэнне да сеткі Інтэрнэт, павінна ажыццяўляцца юрыдычнымі асобамі, іх філіяламі і прадстаўніцтвамі, створанымі ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь, з месцазнаходжаннем у Рэспубліцы Беларусь, а таксама індывідуальнымі прадпрымальнікамі, зарэгістраванымі ў Рэспубліцы Беларусь [ ... ], з выкарыстаннем інфармацыйных сетак, сістэм і рэсурсаў нацыянальнага сегмента сеткі Інтэрнэт, размешчаных на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь і зарэгістраваных ва ўстаноўленым парадку» [7].

Іншымі словамі, камерцыйнае выкарыстанне аб'ектаў прамысловай уласнасці рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь у сферы рэалізацыі тавараў, выканання работ, аказання паслуг павінна ажыццяўляцца ў нацыянальным



Рэпазіторый ВДУ

сегменце сеткі Інтэрнэт. Парушэнне гэтай нормы цягне прыцягненне да юрыдычнай адказнасці, прадугледжанай заканадаўчымі актамі. Акрамя таго, пры выяўленні органамі, пералічанымі ў частцы 1 пункта 11 Указа № 60, вышэйпаказанага патрабавання, гэтыя органы выносяць ва ўстаноўленым парадку юрыдычным асобам і індывідуальным прадпрымальнікам, якія дапусцілі такія парушэнні, прадпісанні аб ліквідацыі выяўленых парушэнняў з указаннем тэрміну, на працягу якога яны павінны быць ліквідаваны [7].

Пры выяўленні грубых або паўторных парушэнняў на працягу шасці месяцаў пасля вынясення прадпісання аб ліквідацыі выяўленых парушэнняў аказанне інтэрнэт-паслуг юрыдычнай асобе або індывідуальнаму прадпрымальніку, які дапусціў такія парушэнні, можа быць прыпынена пастаўшчыком інтэрнэт-паслуг, якія аказваюць яму такія паслугі, па патрабаванні органаў, указаных у частцы першай гэтага пункта [7].

Падводзячы вынік, адзначым, што ў ліцэнзійных дагаворах, у рамках якіх прадастаўляецца права выкарыстання аб'екта прамысловай уласнасці ў Інтэрнэце, ўмова аб тэрыторыі выкарыстання неабходна прадугледжваць як мінімум па двух прычынах: *па-першае*, таму што гэта ўмова выразна акрэслівае межы правамоцтвы ліцэнзіята; а *па-другое,* прадугледжаная ў ліцэнзійнай дамове ўмова аб тэрыторыі правамернага выкарыстання аб'екта прамысловай уласнасці ў сетцы Інтэрнэт падмацоўваецца дзеяннем нормаў Указа № 60, разгледжаных вышэй. Гэта служыць дадатковай гарантыяй выканання бакамі умоў дамовы і інтарэсаў ліцэнзіята.

## Спіс выкарыстаных крыніц


1. Городов, О.А. Интеллектуальная собственность: правовые аспекты коммерческого использования: дисс. докт. юрид. наук: 12.00.04 / О.А. Городов. – С.-Пб., 1999. – 364 с.

2. Егоров, В. В. Лицензии и лицензионные соглашения применительно к промышленной собственности в международной торговле по праву России, США, Великобритании и Германии: дис. ... канд. юрид. наук 12.00.03 / В. В. Егоров. – М., 2003. – 214 с.

3. Еременко, В. И., Евдокимова, В. И. Некоторые формы распоряжения исключительнымправом на объекты промышленной собственности в части четвертой ГК РФ /В. И. Еременко, В. И. Евдокимова // Library.ru. Информационно-справочный портал [Электронный ресурс]. – 2019. – Режим доступа: library.ru›Виртуальная справка›docs/n46817/PO1.doc. – Дата доступа: 16.04.2019.

4. Калиничева, Е. П. Лицензионный договор как основание возникновения обязательства: дис. канд. юрид. наук 12.00.03 / Е.П. Калиничева. – Ростов-на-Дону, 2011. – 193 с.

5. Комментарий к Гражданскому кодексу Республики Беларусь с приложением актов законодательства и судебной практики (постатейный): В 3 кн. Кн.3. / Отв. ред. и руководитель авт. коллектива В.Ф. Чигир. – Амалфея, 2006. – 720 с.


Репозиторий ВГУ

6. Об авторском праве и смежных правах: Закон Респ. Беларусь, 17 мая 2011 г., № 262-З // Эталон-Беларусь [Электронный ресурс] / Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь. – Минск, 2019.

7. О мерах по совершенствованию использования национального сегмента сети Интернет: Указ Президента Респ. Беларусь, 1 февр. 2010 г., № 60; с изм. и доп.: Указ президента Респ. Беларусь, 23 янв. 2014 г., № 46 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 29.01.2014, 1/14787.

8. О некоторых вопросах регистрации доменных имен в пространстве иерархических имен национального сегмента сети Интернет: Приказ Оперативно-аналитического центра при Президенте Республики Беларусь, 18 июня 2010 г. № 47; с изм. и доп.: Приказ Оперативно-аналитического центра при Президенте Республики Беларусь, 28 ноября 2016 г. № 85// Национальный реестр правовых актов Респ. Беларусь, 29.11.2016, № 7/3662.

УДК 347.676.1

## О ПРАВОВОМ ПОЛОЖЕНИИ ИСПОЛНИТЕЛЯ ЗАВЕЩАНИЯ, ДУШЕПРИКАЗЧИКА

*Николичев Д.Н.*
*Витебский государственный университет имени П.М. Машерова*

Гражданский кодекс Республики Беларусь (далее-ГК) регулирует социально-экономическое поведение уполномоченного (управомоченного) лица способного принимать юридически значимые решения в пользу лиц заинтересованных в сохранении и приумножении наследства (ст. 1053, 1068 ГК), представляя возможность исполнителю завещания, душеприказчику, доверительному управляющему самостоятельность в принятии юридически значимых решений относительно прав и обязанностей наследодателя.

В этом контексте важное значение приобретает ответ на вопрос о том, насколько предусмотренные национальным законодательством правила позволяют обеспечить интерес наследников др. лиц, отвечая недалеким перспективам. Уже сегодня в собственности граждан помимо простых объектов недвижимости и ценных объектов движимого имущества находятся доли, акции в хозяйственных обществах, не говоря уже о созданных ими организациях. Так, по данным Министерства юстиции Республики Беларусь, за семь месяцев 2018 г. в нашей стране было зарегистрировано 27482 субъекта хозяйствования и 20727 индивидуальных предпринимателей, растет число физических лиц, осуществляющих накопление капитала в иных формах – ремесленной и другой деятельности. Созданное имущество, приобретенные имущественные права и обязанности, – это потенциальные объекты наследства, требующие профессионального управления не только при жизни, но и после смерти их носителей. При этом специализация в вопросах осуществления прав и исполнения обязанностей уже

Репозиторий ВГУ